# АБ ПРЫРОДЗЕ ДЗЯРЖАВЫ І БЕЛАРУСКАЙ ДЗЯРЖАЎНАСЦІ Ў ПЕРШАЙ ПАЛОВЕ XVI СТ.

*С.А.Калінін*

Сучасныя працэсы дзяржавабудавання і развіцця міжнародных стасункаў патрабуюць аналізу прычын і ўмоў фарміравання пэўнай гістарычнай дзяржавы з пазіцыі тэарэтычнага разгляду развіцця дзяржавы як палітычнага інстытута арганізацыі публічнай улады. Гэта, на наш погляд, трэба праводзіць, улічваючы наступнае:

1. Рэтраспектыўны аналіз развіцця любой *гістарычнай* дзяржавы звычайна робіцца праз палітычную і ідэалагічную прызму яе сучаснага існавання або іншага суб'екта, які прэтэндуе на пэўную "гістарычную спадчыну" (напрыклад, "Сказанне аб Вялікіх княззях Уладзімірскіх" было спробай Уладзімірска-Суздальскай (потым Маскоўскай) Русі ідэалагічна абгрунтаваць свае прэтэнзіі на тэрыторыю ўсёй Русі і прадставіць гістарычную Літву захопнікам «исконно русских земель»).

2. Дзяржава як фенамен арганізацыі публічнай улады з'яўляецца даволі позна. Пры гэтым сутнасць гістарычнай дзяржавы, формы існавання публічнай улады, мэты, якія ставіць перад сабой грамадства, аб'яднанае ў межах дзяржавы залежыць ад многіх фактараў. Так *сучасная* заходняя дзяржава была створана як інструмент, праз які Заходняя Еўропа вырашыла канфлікт паміж рознымі плынямі Заходняга Хрысціянства (Рэфармацыя і Контррэфармацыя). Другія дзяржаўныя формы існавання публічнай улады маюць якасна іншую прыроду, якая выцякае з пэўных гістарычных і іншых умоў (напрыклад, горад-дзяржава мог існаваць толькі пры абмежаваных тэрыторыі і колькасці насельніцтва, пры іх павелічэнні форма праўлення аб'ектыўна змянялася; усходняя дэспатыя, якая была аб'ектам крытыкі антычных элінаў, была арганічным ладам аб'яднання вялікіх тэрыторый і розных народаў, што патрабавала жорсткай цэнтралізаванай улады, якая абапіралася на войска і бюракратыю).

3.Сучасны перыяд міжнародных адносінаў характарызуецца крызісам Вестфальскай мірнай сістэмы, заснаванай на прызнанні дзяржавы выключным суб’ектам міжнародных адносінаў, які мае суверэнную ўладу над насельніцтвам пэўнай тэрыторыі. Такі статус дзяржавы дазволіў ёй праз выцісканне іншых суб’ектаў публічнай улады з палітычнага і грамадскага жыцця мець інструментальна абсалютны і таталітарны характар. Пры гэтым таталітарызм як аб’ектыўную рысу заходняга тыпу дзяржаўнасці трэба адрозніваць ад падобных з’яў у іншых дзяржавах, дзе моцная дзяржаўная улада і, як следства буйны дзяржаўны апарат, выконвалі функцыю асноўнага інтэгратара тэрытарыяльна вялікага грамадства. Напрыклад, для усходніх дэспатый была характэрна наяўнасць моцнай сялянскай абшчыны, і як следства, даволі развітага самакіравання, якое ў Заходняй Еўропе мае гарадскія карані. Зараз паралельна з дзяржавамі ўзнікаюць і існуюць іншыя інстытуты, якія прэтэндуюць на публічную ўладу, абмяжоўваючую суверэнітэт дзяржавы (міжнародныя палітычныя, эканамічныя і іншыя арганізацыі, непрызнаныя дзяржавы, транснацыянальныя карпарацыі, рэлігійныя арганізацыі і г.д.).

4. Дзяржаўнасць Вялікага княства Літоўскага, Рускага і Жамойцкага ў XVI стагоддзі цяжка называць выключна беларускай, літоўскай, украінскай або іншай. Вялікае княства мае дачыненне да гісторыі не толькі Беларусі, але і да гісторыі сучасных Летувы, Украіны, Польшчы, Латвіі, Расіі. Пры чым гістарыяграфія кожнай сучаснай *нацыянальнай* краіны разглядае вызначаны перыяд з сваіх *сучасных* інтарэсаў, спрабуючы канстатаваць сучасны status quo, што не вельмі аб’ектыўна. На наш погляд, трэба улічваць розніцу паміж сучаснымі нацыянальнымі дзяржавамі – спадкаемцамі Вялікага княства, якія зараз шукаюць сваё месца ў сусветнай гісторыі (Беларусь, Летува, Украіна, Латвія і г.д.) і Вялікім княствам, як дзяржавай, дзе этнічная ідэнтыфікацыя не мела сучаснага значэння. Напрыклад, на трон Рэчы Паспалітай запрашаліся француз Генрых Валуа, трансільванец Стэфан Баторый, швед Жыгімонт Ваза. Але трэба ўлічваць, што цэнтрам Вялікага княства былі беларускія землі і

Віленшчына, якая юрыдычна была перададзена Летуве паводле рашэнняў дзяржаў-пераможцаў у Першай сусветнай вайне, а фактычна толькі ў 1939 годзе рашэннем Савецкага Урада пасля далучэння тэрыторый Заходняй Беларусі да СССР.

5. Выкарыстанне даволі распаўсюджанай зараз адзнакі пэўных гістарычных падзей праз іх дэмакратычнасць (недэмакратычнасць), бо ў сучаснасці такая рыса прызнаецца галоўнай і найважнейшай, на наш погляд, з'яўляецца не вельмі навукова карэктным. Дзяржаўнасць трэба аналізаваць з пазіцыі дасягнення (недасягнення) пэўных мэтаў, якія стаялі перад дзяржавай (грамадствам) у той перыяд. У іншым выпадку "дэмакратычныя" інстытуты такой дзяржавы будуць прадметам даследвання сусветнай, а не нацыянальнай гісторыі, бо заўчасна "дэмакратызаваная" дзяржава знікне з палітычнай карты свету (што і атрымалася з Рэччу Паспалітай у канцы XVIII ст.).

6. Пры выкарыстанні пэўных гістарычных тэрмінаў (абсалютызм, дэмакратызм і г.д.) трэба ўлічваць кантэкст іх узнікнення і магчымае несупадзенне істотных прыкмет пры характарыстыцы з'яў, якія адносяцца да розных цывілізацыйных і культурных тыпаў. Пры гэтым у развіцці любой дзяржаўнасці можна вылучаць пэўныя аб'ектыўныя закамернасці, на якія вельмі істотна ўплываюць асаблівасці яе гістарычнага шляху.

XVI стагоддзе з'яўляецца вельмі важным этапам у развіцці сучаснай дзяржавы, якая выступіла новай формай тэрытарыяльнага аб'яднання і ідэнтыфікацыі насельніцтва, замяніўшы традыцыйную для Сярэднявечча рэлігійную ідэнтыфікацыю. Такая ідэнтыфікацыя насельніцтва дазваляла групіраваць насельніцтва па канфесіях (каталікі, праваслаўныя, пратэстанты, іудзеі, мусульмане), асабліва не прывязваючыся да пэўнай тэрыторыі, на якой магло дзейнічаць адначасова некалькі юрысдыкцый (напрыклад, саслоўных, нацыянальных і г.д.). Але пад час Контррэфармацыі такая ідэнтыфікацыя выступіла адной з формаў будучага нацыяналізма як віда грамадзянскай рэлігіі, формы стаўлення да тэрытарыяльнай дзяржавы як да сваёй (каталік – паляк, праваслаўны – рускі, кожны, хто жыве у Францыі, француз).

Для ВКЛ праблема забеспячэння рэлігійнага міру была адной з найбольш важных для захавання ўласнай незалежнасці. З аднога боку, для праваслаўных Масква з'яўлялася роднай па веры, гэта горад, дзе, не гледзячы на спробы Вялікіх князёў заснаваць сваю незалежную мітраполію, знаходзіўся Мітрапаліт (потым Патрыярх), які лічыў тэрыторыю Вялікага княства *сваёй* епархіяй. Такім чынам, знаходжанне духоўнага цэнтра ў Маскве давала падставу Маскоўскай дзяржаве ўмешвацца ў справы ВКЛ. З другога боку, палякі не прызнавалі літвінаў за роўных по веры, спрабуючы праз Касцёл дамагчыся поўнай інкарпарацыі і ліквідацыі ВКЛ, а таксама паланізацыі насельніцтва.

У XVI стагоддзі перажываюць крызіс такія формы асабіста-тэрытарыяльнай ідэнтыфікацыі як Рымская Царква і Свяшчэнная Рымская імперыя Германскай нацыі. Узнікненне гарадоў і развіццё капіталістычных адносінаў пачынае мяняць стэрэатып паводзінаў насельніцтва, служэнне (Богу, суверэну і г.д.) як форма светапогляду замяняецца імкненнем да дасягнення уласных інтарэсаў і пошукам тых інструментаў, якія будуць здольнымі вырашыць сацыяльныя і асабістыя канфлікты. Адначасова пачынаецца працэс фарміравання асобных нацыянальных дзяржаў, якія спрабуюць выйсці з-пад уплыву Царквы і Імперыі (тэндэнцыі "англіканізма" і "галіканізма" Рымскай Царкве). Такая нацыянальная дзяржава прэтэндуе на паўнату улады на сваёй тэрыторыі (суверэнітэт) і пачынае паступова абмяжоўваць і ліквідаваць усё іншыя канкурыруючыя сацыяльныя структуры. Гэта адлюстроўваецца ў тэндэнцыях да цэнтралізацыі ўлады, права і судаводства. Пры гэтым трэба адрозніваць вызначаныя працэсы ў Заходняй Еўропе ад іншых дзяржаў.

Крызіс Рымскай Царквы і Імперыі, адначасова, не азначае падзення рэлігійнасці ў грамадстве, бо Рэфармацыя і Контррэфармацыя з'яўляюцца тымі перыядамі, калі рэлігійнае напружанне дасягае вельмі высокага ўзроўню. Пры гэтым згодна Л. М. Гумілёва гэты перыяд з'яўляецца фазай надлома адзінай заходнееўрапейскай цывілізацыі, бо Рэфармацыя раскалола

Еўропу па канфесійным прыкметам, інакш структурызаваўшы насельніцтва. Гэта выступіла пагрозай для асобных дзяржаў, якія маглі быць проста падзелены па канфесійных прыкметах, і абумовіла неабходнасць стварэння іншых механізмаў тэрытарыяльнага аб'яднання насельніцтва. Для ВКЛ такая еўрапейская праблема абцяжарана наяўнасцю значнай колькасці праваслаўных, для якіх і каталікі, і пратэстанты (што не перашкаджала ім супрацоўнічаць у палітычнай сферы) з'яўляюцца дагматычна чужымі.

Ініцыятарамі цэнтралізацыі ў Заходняй Еўропе былі гараджане, якія згаджаліся на неабмежаваную ўладу адной асобы (абсалютызм) замест некалькіх канкурыруючых юрысдыкцый. Пры гэтым такая абсалютная ўлада абмяжоўвалася вопытам гарадскога самакіравання, а таксама традыцыйным поглядам на другаснасць дзяржавы як сацыяльнага інстытута, якая ствараецца праз блаславенне Рымскай Царквы як формы грамадзянскай супольнасці.

У Маскоўскай дзяржаве цэнтралізацыя мела іншыя карані. Па-першае, для Праваслаўя яшчэ з Візантыі характэрны давер і прага моцнай дзяржаўнай ўлады, з якой Царква не канкурыравала ў палітычнай сферы, але надаючы яе дзеянням маральную адзнаку. У хрысціянскай Заходняй Еўропе пасля падзення Заходняй Рымскай імперыі свецкая ўлада звычайна не мела таго аўтарытэта, які быў у Рымскай курыі, здолеўшай фактычна стварыць новую еўрапейскую дзяржаўнасць, якая разумелася як другасная ў дачыненні да Царквы. Па-другое, ступень цэнтралізацыі Старажытнай Русі застаецца актуальнай праблемай у агульнай гісторыі, якую можна разглядаць і як дастаткова цэнтралізаваную ў межах шляху "з вараг у грэкі", і як садружнасць паўдзяржаў, аб'яднаную дынастыяй Руракавічаў (потым Манамахавічаў, за выключэннем Полацка, дзе правілі Ізяслававічы) і царкоўнай іерархіей. Феадальнае раздробленне ў пэўныя перыяды магло ўспрымацца і як звычайная (неабходная) з'ява і як зло. Па-трэцяе, знаходжанне Паўночна-Усходняй Русі ў складзе Залатой Арды прынесла на гэтыя землі вопыт мангольска-кітайскай цэнтралізацыі і арганізацыі ўлады.

Пры гэтым гістарычна ранняя цэнтралізацыя на Русі мела аб’ектыўны характар, бо значныя межы і частыя сутычкі з суседзямі патрабавалі моцнай цэнтралізаванай улады, здольнай арганізаваць належную абарону. Таксама кантроль над шляхам “з вараг у грэкі” патрабаваў для забяспячэння яго функцыянавання інструментаў узгаднення палітычнай ўлады розных цэнтраў (Так працягам гэтай тэндэнцыі будзе Дамова Смаленска, Полацка і Віцебска з Рыгай і Гоцкім берагам 1229 года). Пры гэтым моцная ўлада князя ўзаемадзейнічала з гарадскім самакіраваннем, або князь запрашаўся як ваенны кіраўнік. Адзначым, што інструментальная цэнтралізацыя Маскоўскай дзяржавы мае больш усходні характар, бо ўплыў Візантыі і Старажытнай Русі быў абмежаваны галіной культуры.

ВКЛ можна разглядаць як дзяржаву, якая знаходзілася на Памежжы розных цывілізацый, таму аднолькава вырашыць яе прыналежнасць да Усходу або Захаду складана. Але асаблівасцю з’яўлялася накладанне каталіцкага спосаба уладарання на праваслаўны менталітэт, што прывяло да расколу пасіянарнасці літвінаў. Праваслаўныя атаясамлялі сябе потым з аднаверным Вялікім князем Маскоўскім і, карыстаючыся феадальным правам ад’езду, перахадзілі да яго на службу. Пры гэтым Маскоўскі уладар, прымаючы на служэнне, потым не іх адпускаў, а лічыў здраднікамі. Каталікі спрабавалі браць за ўзор Польшу. Пры гэтым можна сцвярджаць немагчымасць мірнага суіснавання гэтых канфесій пры дамінаванні каталіцтва, што падцвярджаецца тэндэнцыяй развіцця прававога статуса шляхты гэтых веравызнанняў. Каталікі, пачынаючы з Крэўскай і Гарадзельскай уніі, набываюць сабе прывілеі, выціскаючы праваслаўных з ўсіх сфер жыцця, а праваслаўныя патрабуюць роўнасці ў правах. Вялікім князям (выключна каталікам па веравызнанню) прыходзіцца балансаваць паміж патрабаваннямі Курыі аб знішчэнні схізмы і неабходнасцю абараняць усходнюю мяжу сіламі памежнай праваслаўнай шляхты. Так Жыгімонт Стары не вельмі звяртаў увагу на неналежнае выкананне прывілеяў аб абмежаванні праў праваслаўных.

Любая сярэднявечная дзяржава складалася з земляў, якія мелі розны прававы і этнічны статус, што было абумоўлена рознымі спосабамі іх увахода ў склад дзяржавы (захоп, дынастычны шлюб, купля, абмен, прысяга на служэнне і г.д.). Па меры ўскладнення грамадскіх адносінаў і фарміравання прафесійных кіраўнікоў (бюракратыі) узнікала неабходнасць уніфікацыі прававых статусаў як земляў, так і асоб. Такая ўніфікацыя магла быць дасягнута толькі праз выданне агульнадзяржаўных кадыфікаваных нарматыўных прававых актаў (напрыклад, прывілеі Ягайлы 1387 г., Казіміра 1447 г., Аляксандра 1492 г., Бельскі прывілей і інш.) і праз стварэнне адзінай сістэмы адміністрацыйна-тэрытарыяльнага падзелу, і у тым ліку праз фарміраванне судовай сістэмы.

Такім чынам, Статут 1529 г. як першая спроба сістэматызацыі заканадаўства выступае часткай складаных працэсаў цэнтралізацыі Вялікага княства, адлюстроўвае пэўныя тэндэнцыі Гуманізму, калі чалавек пачынае разглядацца не як вернік, член карпарацыі (саслоўя), а як грамадзянін, роўны перад законам і ўладай. Патрэба ў Статуце была таксама абумоўлена прывілейным характарам заканадаўства таго перыяду, нормы якога трэба было пераводзіць з партыкулярнага ў агульнадзяржаўныя.

Пры гэтым пэўныя “дэмакратычныя” (з сучасных поглядаў) моманты ў Статуце фактычна заканадаўча абмяжоўвалі ўладу Вялікага князя на карысць буйных феадалаў, што далей не вельмі добра адбілася на лёсе дзяржавы. Так Статут абвяшчаў норму, згодня якой людзі, як убогія, так і багатыя, павінны былі судзіцца згодна гэтым актам. Вялікі князь, адначасова з абавязкамі захавання тэрытарыяльнай цэласнасці дзяржавы і існуючых законаў, недапушчэння іншаземцаў на дзяржаўныя пасады, ненадавання ім маёнткаў, земляў, чыноў, абавязваўся выдаваць новыя законы толькі па згодзе з панамі-радай. Пазбаўленая ўлады дробная шляхта, якая бачыла ўзор польскай “залатой вольнасці”, прагнула аналагічнага статуса, ігнаруючы агульныя інтарэсы. Напрыклад, Віцебскі сейм 1562 года аб неабходнасці заключэння уніі з Польшчай быў склікан праваслаўнай шляхтай на гэтых падставах.

Пры гэтым адносная незалежнасць Вялікага княства пры падпісанні Люблінскай уніі была захавана дзякуючы буйным феадалам.

Лічым, што любыя гістарычныя працэсы павінны адбывацца ў свой час і вырашаць праблемы, якія стаяць перад дзяржавай. Любая ўлада па сваёй сутнасці з’яўляецца пэўным прымусам да насельніцтва для дасягнення агульнасацыяльных мэтаў. У выпадку несвоечасовасці пазітыўная з’ява можа несці гібель дзяржаве. Падсумоўваючы вынікі, трэба адзначыць наступныя рысы беларускай дзяржаўнасці ў разглядаемы перыяд:

1. У XVI ст. паступова адбываюцца змены ў характары ідэнтыфікацыі насельніцтва да дзяржавы, канфесіянальная прыналежнасць пачынае дапаўняцца этнічнай. Напрыклад, павялічваюцца супярэчнасці паміж этнічнымі часткамі ВКЛ (будучыя Летува, Беларусь, Украіна).

2. ВКЛ па аб’ектыўных і суб’ектыўных прычынах не змагло завяршыць сваю цэнтралізацыю, не здолеўшы стварыць моцную дзяржаўную бюракратычную ўладу праз наданне магчымасці асобам з іншых саслоўяў дамагацца дзяржаўных пасад. Шляхецкая дэмакратыя па ўзору Польшчы і канкурэнцыя буйных магнатаў прывялі да заняпада дзяржавы.

3. Па пэўных прычынах Рэч Паспалітая (асабліва пры Жыгімонце Вазе) звязала свой лёс з інтарэсамі Рымскай Курыі, ахвяраваўшы ўласнымі інтарэсамі, што прывяло да выціскання некаталікоў з палітычнага, грамадскага і іншага жыцця. Рэч Паспалітая, абараняючы інтарэсы каталіцтва, не здолела стаць цалкам суверэннай дзяржавай, прыняць і гарантаваць уласны Нантскі эдыкт. Пры гэтым Маскоўская дзяржава таксама звязвала свой лёс з Праваслаўем (магчыма, гэта рыса любой монаканфесійнай славянскай дзяржаўнасці) праз канцэпцыю “Масква – трэці Рым” (потым “Масква – новы Іерусалім”), але іншыя дагматычныя стасункі паміж дзяржавай і Царквой і супадзенне дзяржаўнага і рэлігійнага цэнтраў прывялі да іншых вынікаў. Пры гэтым і Літва, і Масква маглі забяспечыць мірнае існаванне мусульман на сваёй тэрыторыі.

4. ВКЛ, ствараючы прававыя і судовыя інстытуты забеспячэння інтарэсаў розных саслоўяў, не здолела стварыць належную сістэму выканання дзяржаўных і судовых рашэнняў па прычыне імкнення шляхты (асабліва дробнай) да прывілеяванага становішча ў дзяржаве. Маскоўская дзяржава, абапіраючыся на жорскую цэнтралізацыю, прыярытэт надавала магчымасці выканання дзяржаўных рашэнняў.